Планы тэхнічнага перааснашчэння прадпрыемстваў, паляпшэння ўмоў працы часам складаліся фармальна, уключалі нязначныя, меўшыя асобны характар мерапрыемствы, якія не закраналі карэнным вобразам ні тэхнічны ўзровень вытворчасці, ні тыя ўмовы, у якіх людзі павінны былі працаваць.

З боку партыйных арганізацый іншы раз адсутнічаў пастаянны і дзейсны кантроль за работай па рэалізацыі прымаемых рашэнняў, накіраваных на стварэнне спрыяльных умоў працы. Партыйныя камітэты не здолелі ўсюды павысіць адказнасць гаспадарчых кадраў, усіх камуністаў, накіраваць іх намаганні на вырашэнне праблемы. Яны не ўнікалі ў дзейнасць прафсаюзаў, не нацэльвалі іх на сістэматычнае ўдасканальванне аховы працы і тэхнікі бяспекі ў вытворчасці.

Адной з сур'ёзных прычын нездавальняючага становішча ў вырашэнні праблемы з'яўлялася адсутнасць на многіх прадпрыемствах дакладных сведак і аб'ектыўнай інфармацыі аб стане ўмоў працы, аб колькасных і якасных змяненнях ў даннай вобласці. Гэта не дазваляла правільна вызначаць асноўныя напрамкі работы па паляпшэнню ўмоў вытворчай дзейнасці працоўных. Таму ў партыйных камітэтах, на прадпрыемствах аб эфектыўнасці рэалізуемых мерапрыемстваў меркавалі не па сапраўдным параменам, а па засваенню выдзеленых на гэтыя мэты сродкаў, якія расходаваліся часам не рацыянальна.

Партыйныя арганізацыі не здолелі наладзіць учот, аналіз, абагульненне дасягнутых перадавымі калектывамі вынікаў, слаба прапагандавалі іх вопыт. Яны не даацэньвалі ўзрастаючую ролю ў паскарэнні тэмпаў тэхнічнага прагрэсу, паслядоўным скарачэнні ручной працы такога важнага фактара, як паўсядзённае выхаванне творчай актыўнасці рабочых, ІТР, служачых. Таму фармалізм ў арганізацыі аглядаў, сацыялістычнага спаборніцтва, неэфектыўнае выкарыстанне сродкаў матэрыяльнага і маральнага заахвочвання за работу калектываў без траўм, за стварэнне нармальных умоў працы на кожным рабочым месцы стрымлівалі актыўнасць і ініцыятыву працоўных. У выніку — несвоечасовае вырашэнне пытанняў механізацыі цяжкіх і працаёмкіх работ, паляпшэння вытворчых і бытавых умоў прыводзілі да вялікіх эканамічных і сацыяльных страт. Напрыклад, павялічвалася цякучасць кадраў, асабліва сярод маладых людзей з даволі вялікім агульнаадукацыйным узроўнем.

Рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў грамадстве, намечаныя XXVII з'ездам КПСС, прадугледжваюць актыўную сацыяльную палітыку. Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, перабудова патрабуюць прыярытэтнага развіцця сацыяльнай сферы для таго, каб больш поўна задавальняліся патрэбнасці савецкіх людзей у добрых умовах працы, быту, адпачынку. Толькі ў спалучэнні з вырашэннем штодзённых пытанняў, якія хвалююць людзей, могуць быць вырашаны кардынальныя праблемы жыцця савецкага грамадства.

[1] Гл.: Советская Белоруссия. 1977. 5 марта; Народное хозяйство Белорусской ССР: Статистический ежегодник. Минск, 1976. С. 62.
[2] Гл.: Промышленность Белоруссии. 1981. № 8. С. 39.
[3] ПА Брэсцкага АК КПБ. Ф. 5209, воп. 1, спр. 25, л. 54.
[4] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 152, спр. 105, л. 139.
[5] Гл.: Промышленность Белоруссии. 1980. № 2. С. 20.
[6] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 23, воп. 48, спр. 10, л. 154—156.
[7] Гл.: Советская Белоруссия. 1977. 5 марта; Советская Белоруссия. 1982. 3 февраля.

У. Д. КРУКОЎСКІ

## РОЛЯ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ АТЭІСТЫЧНЫХ КАДРАЎ (1971—1980)

У. І. Ленін неаднаразова ўказваў на прамую залежнасць вынікаў ідэалагічнай дзейнасці партыі, іншых грамадскіх арганізацый ад правільнага падбору і расстаноўкі прапагандыстаў і лектараў. Асабліва стараннага падыходу ён патрабаваў да прапагандысцкіх кадраў. «Сапраўды вытрыманых прынцыпова і здольных прапагандыстаў **вельмі нямнога** (і каб стаць

такім. трэба многа павучыцца і набраць вопыту), і такіх людзей трэба спецыялізаваць, займаць іх цалкам і берагчы сугуба»[1].

У навукова-атэістычнай рабоце гэтыя ленінскія палажэнні напаўняюцца асаблівым сэнсам, таму што прапагандыстам часта даводзіцца мець справу з людзьмі, свядомасць якіх штучна аддзелена ад усяго таго, што якім-небудзь чынам не ўзгадняецца з іх рэлігійнымі перакананнямі. Не выпадкова ЦК КПСС заўсёды надаваў пільную ўвагу падрыхтоўцы кваліфікаваных атэістычных кадраў. У пастанове Цэнтральнага Камітэта КПСС ад 16 ліпеня 1971 года «Аб узмацненні атэістычнага выхавання насельніцтва» ад партыйных і іншых арганізацый патрабавалася звярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў прапагандыстаў атэізму [2].

Важнае месца ў падрыхтоўцы прапагандыстаў і лектараў атэізму Камуністычная партыя адводзіць вышэйшай школе, камсамолу ВНУ. Неабходнасць павышэння іх ролі ў падрыхтоўцы атэістычных кадраў знайшла адлюстраванне ў мерапрыемствах ЦК КПБ па ўзмацненню атэістычнага выхавання насельніцтва (верасень, 1971) і мерапрыемствах ЦК ЛКСМБ па ўзмацненню атэістычнага выхавання камсамольцаў і моладзі рэспублікі (верасень, 1970)[3].

Рад камітэтаў камсамола ВНУ пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый развярнуў работу па падрыхтоўцы лектараў і прапагандыстаў навуковага атэізму. Падрыхтоўцы атэістычных кадраў у многім садзейнічала праграмнае вывучэнне студэнтамі навук, якія нясуць у сабе атэістычны запал, і перш за ўсё курса «Асновы навуковага атэізму». Камсамольскія арганізацыі дабіваліся, каб дадзеная дысцыпліна выкладалася на высокім ідэйна-тэарэтычным і метадычным узроўні. Формамі дзейнасці камітэтаў камсамола па падрыхтоўцы атэістычных кадраў у даследуемы перыяд з'яўляліся таксама атэістычныя аддзяленні факультэтаў грамадскіх прафесій, школы маладых лектараў-атэістаў, клубы ваяўнічых атэістаў, народныя універсітэты навуковага атэізму. Сумесна з рэктаратамі, партыйнымі камітэтамі камсамольскія арганізацыі ўдзельнічалі ў распрацоўцы праграм атэістычных фарміраванняў, падборы слухачоў і кантролі за іх работай у працоўных калектывах.

Паспяхова рашаліся пытанні падрыхтоўкі рэзерву прапагандысцкіх кадраў на факультэце грамадскіх прафесій Гродзенскага медыцынскага інстытута. Вучэбнай праграмай прадугледжвалася размеркаванне слухачоў па базавых прадпрыемствах: завод карданных валаў, прадзільна-ніткачны камбінат, абутковая фабрыка «Нёман». Кожны слухач-камсамолец атрымліваў накіраванне і замацоўваўся за вопытным прапагандыстам, пасля наведвання некалькіх заняткаў якога ён сам рыхтаваўся да іх правядзення. У канцы практыкі рабіўся аналіз некалькіх праведзеных заняткаў, і кожны слухач даваў на факультэт водгук прапагандыста, партыйнай або камсамольскай арганізацыі.

Станоўчы вопыт падрыхтоўкі рэзерву прапагандысцкіх кадраў атэізму на факультэтах грамадскіх прафесій набылі Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, Віцебскі ордэна «Знак Пашаны» ветэрынарны інстытут імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Паглыбленаму засваенню студэнтамі тэарэтычных і практычных пытанняў атэістычнага выхавання і барацьбы з рэлігійнай ідэалогіяй у многіх вышэйшых навучальных установах Беларусі садзейнічалі школы маладога лектара, створаныя па ініцыятыве камсамольскіх камітэтаў. Тут на працягу 2—3 год праходзілі падрыхтоўку кваліфікаваныя кадры прапагандыстаў, лектараў-атэістаў.

У Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага падрыхтоўка лектараў-атэістаў ажыццяўлялася па трохгадовай праграме. На працягу першага года навучання слухачам чыталіся лекцыі, прысвечаныя атэізму і рэлігіі. На другім годзе працавалі секцыі, дзе вывучаліся праблемы атэістычнага выхавання на ўроках гісторыі, біялогіі, хіміі, абмяркоўваліся тэксты лекцый, пробныя лекцыі ў аўдыторыі. На трэцім годзе чыталіся лекцыі, прысвечаныя метадам атэістычнага выхавання, слухачы самі выступалі з лекцыямі і гутаркамі.

Эфектыўна працавалі школы маладога лектара ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, Мінскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце, Беларускім інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі.

Пошукі сістэмы атэістычнага выхавання, якая забяспечвае спалучэнне тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі лектараў—грамадскіх работнікаў

і прапагандыстаў атэізму, прыводзілі камітэты камсамола да арганізацыі атэістычных клубаў. Дзейснай формай падрыхтоўкі кадраў-атэістаў стаў клуб маладых ваяўнічых атэістаў Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, створаны ў 1972 годзе на базе факультэта грамадскіх прафесій. Кіраўніцтва работай ажыццяўляла праўленне на чале з вопытным педагогам-атэістам З. О. Зімак. Усе члены клуба на працягу двух год праходзілі абавязковы курс тэарэтычнага абучэння на атэістычным аддзяленні школы маладога лектара, а потым, з засваеннем неабходнай тэарэтычнай падрыхтоўкі, выкарыстоўвалі атрыманыя веды на практыцы: выпускалі насценгазету «Ваяўнічы матэрыяліст», выступалі з лекцыямі і гутаркамі, нумарамі мастацкай самадзейнасці перад студэнцкай аўдыторыяй, у будатрадах, перад насельніцтвам вобласці, вялі актыўную індывідуальную атэістычную работу. У 1979 годзе бюро Брэсцкага абкома камсамола абагуліла вопыт работы клуба і рэкамендавала яго для выкарыстання іншым навучальным установам вобласці. Добра зарэкамендаваў сябе таксама клуб ваяўнічых атэістаў і ў Брэсцкім педагагічным інстытуце.

Неабходнасць павялічвання колькасці атэістычных кадраў, паглыблення якасці атэістычнай прапаганды паставілі перад партыйнай і камсамольскай арганізацыямі Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута пытанне аб арганізацыі народнага універсітэта навуковага атэізму. Ён быў створаны ў 1972 годзе на базе атэістычнага аддзялення факультэта грамадскіх прафесій. Навучаннне ў народным універсітэце праводзілася па трохгадовай праграме. За гэты час у ходзе лекцыйных і семінарскіх заняткаў слухачы атрымлівалі веды па марксісцка-ленінскай тэорыі навуковага атэізму, методыцы правядзення атэістычнай работы з насельніцтвам. Асаблівая ўвага ўдзялялася практычнаму ўдзелу студэнтаў у навукова-атэістычным выхаванні. Ужо з першага года навучання слухачы выступалі з рэфератамі перад студэнтамі і ў падшэфных сельскіх школах, вялі сацыялагічныя даследаванні. У мэтах пашырэння геаграфіі атэістычнага ўплыву народны універсітэт стварыў філіялы — двухгадовыя атэістычныя семінары ў г. п. Сопаткіно, вёсках Індура і Гожа.

Але прыведзеныя прыклады станоўчай работы па падрыхтоўцы атэістычных кадраў у 70-я гады былі нешматлікімі і не атрымалі шырокага распаўсюджання ў рэспубліцы. Адзначаныя XX з'ездам ВЛКСМ негатыўныя тэндэнцыі ў рабоце камсамола аказаліся ўласцівымі і камітэтам камсамола вышэйшых навучальных устаноў. Работа многіх камсамольскіх арганізацый ВНУ па падрыхтоўцы атэістычных кадраў вызначалася на падставе суб'ектыўных адзнак з боку камсамольскіх кіраўнікоў, умела складзеных справаздач, маніпулявання лічбавымі дадзенымі.

Многія выпускнікі прапагандысцкіх аддзяленняў факультэтаў грамадскіх прафесій, школ маладога лектара, клубаў ваяўнічых атэістаў, універсітэтаў навуковага атэізму пасля заканчэння ВНУ спынялі актыўную атэістычную дзейнасць. Па рэспубліцы толькі палова выпускнікоў, якая атрымала спецыяльнасць прапагандыста на факультэтах грамадскіх прафесій, удзельнічала ў атэістычнай рабоце. У Гродзенскай вобласці, дзе пытанні атэістычнага выхавання моладзі рашаліся крыху лепш, гэты паказчык, па справаздачах камітэтаў камсамола, складаў крыху больш 50 % [4]. Прыкладна такое ж становішча назіралася і з выпускнікамі школ маладога лектара, універсітэтаў атэізму.

Адбывалася гэта як у выніку фармальнага падыходу шэрагу камітэтаў камсамола да камплектавання атэістычных аддзяленняў факультэтаў грамадскіх прафесій і іншых фарміраванняў, так і фармальных адносін да ідэалагічнай работы з боку кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, камсамольскіх работнікаў. Таму многія выпускнікі ўхіляліся ад удзелу ў ідэалагічнай рабоце. Гэтаму садзейнічалі і тыя абставіны, што работнікі райкомаў і гаркомаў камсамола мелі нізкую атэістычную кампетэнтнасць, недаацэньвалі значнасць атэістычнага выхавання, не цікавіліся грамадскай спецыяльнасцю маладых выпускнікоў пры пастаноўцы іх на камсамольскі ўчот. Больш як сем месяцаў Бярозаўскі РК ЛКСМБ, напрыклад, не прыцягваў для правядзення атэістычнай прапаганды сярод моладзі раёна Галіну Дубанос, якая паспяхова закончыла аддзяленне навуковага атэізму Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. А зрабіць гэта было неабходна хоць бы таму, што лектарская група райкома ЛКСМБ не прачытала ніводнай лекцыі па навукова-атэістычнай тэматыцы.

Аб абыякавых адносінах асобных адказных камсамольскіх работнікаў да выкарыстання атэістычных кадраў сведчыць і той факт, што ў струк-

туры лекцыйнай прапаганды навукова-атэістычная тэма ў лектарскіх груп некаторых гаркомаў і райкомаў камсамола складала толькі 1—4 %[5]. Адна з прычын падобнага становішча, напэўна, заключалася ў адсутнасці належнай сістэмы кантролю за грамадскай дзейнасцю выпускніка. У сярэдзіне 70-х гадоў камсамольскай арганізацыяй Беларускага інстытута народнай гаспадаркі рабіліся спробы выпрацаваць такую сістэму, але распаўсюджання не атрымалі.

Аб няўвазе да падрыхтоўкі маладых атэістычных кадраў сведчыла і малалікасць атэістычных фарміраванняў вышэйшых навучальных устаноў. Напрыклад, у Мінскім радыётэхнічным інстытуце на чатырох аддзяленнях школы маладога лектара (адно з іх атэістычнае) займалася 48 студэнтаў, у радзе ВНУ Гомеля і Брэста падрыхтоўка рэзерву прапагандысцкіх кадраў, па сутнасці, не вялася[6]. Работа многіх факультэтаў грамадскіх прафесій, школ маладога лектара вышэйшых навучальных устаноў характарызавалася слабай наведвальнасцю, нерэгулярнасцю правядзення заняткаў. Абыякавыя адносіны раду рэктаратаў, партыйных і камсамольскіх камітэтаў да дзейнасці ідэалагічных фарміраванняў дрэнна адбіваліся на забеспячэнні атэістычных аддзяленняў нагляднымі дапаможнікамі і тэхнічнымі сродкамі прапаганды. Рабоце атэістычных фарміраванняў часта перашкаджалі няўзгодненасць дзеянняў, фармальны падыход да іх патрэб грамадскіх арганізацый. Усё гэта зніжала эфектыўнасць вучэбнага працэсу. У прыватнасці, у Магілёўскім педагагічным інстытуце дзейнічалі тры самастойныя школы маладога лектара: міжнародніка, атэіста і прыродазнаўцы. У кожнай школе быў кіраўнік, старшыня і яго намеснік. Аднак адсутнасць савета школ, адзінага плана работы, раз'яднанасць прывялі да таго, што школы прыродазнаўцы і атэіста, не атрымліваючы неабходнай дапамогі з боку камітэта камсамола, фактычна бяздзейнічалі[7].

Нават гэты далёка не поўны пералік недахопаў у дзейнасці камітэтаў камсамола вышэйшых навучальных устаноў па падрыхтоўцы кадраў атэістычнай работы з моладдзю дазваляе зрабіць вывад, што яна не адпавядае патрабаванням часу.

Студзеньскі (1987) Пленум ЦК КПСС паставіў задачу ўмацаваць ідэалагічную работу высокакваліфікаванымі, падрыхтаванымі кадрамі, якія ў поўнай меры адчуваюць пульс часу, глыбока разумеюць сутнасць пастаўленых задач, здольны эфектыўна прапагандаваць палітыку партыі, пераконваць і арганізоўваць людзей. Перабудова падрыхтоўкі кадраў па атэістычнаму выхаванню моладзі на новым якасным узроўні магчыма толькі на падставе ўдумлівага аналізу ўрокаў мінулага, выкарыстання лепшага вопыту камсамольскіх арганізацый. Эфектыўнасць гэтага напрамку атэістычнай работы будзе дасягацца тады, калі камсамольскія камітэты будуць добра валодаць праблемай падрыхтоўкі атэістычных кадраў, будуць займацца ёй творча, выкарыстоўваючы дасягненні лепшых атэістаў рэспублікі і краіны.

[1] Ленін У. І. Творы. Т. 6. С. 218.

[2] Гл.: КПСС о формировании нового человека: Сборник документов и материалов (1966—1976). М., 1976. С. 122.

[3] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 81, спр. 2362, л. 40; ф. 63, воп. 7, спр. 227, л. 48.

[4] Гл.: Знамя юности. 1977. 16 снежня; ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 20, воп. 26, спр. 6, л. 28.

[5] Гл.: Знамя юности. 1972. 2 февр.

[6] Там жа. 1977. 16 дек.; ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 63, воп. 37, спр. 51, л. 28.

[7] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 63, воп. 50, спр. 23, л. 51.

В. С. КЛИМОВИЧ

# УГЛУБЛЕНИЕ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО ДЕМОКРАТИЗМА В УСЛОВИЯХ ПЕРЕСТРОЙКИ

Развитие советского государственного строя обеспечивается выбором наиболее эффективных путей и средств обеспечения полновластия трудящихся, суть которого сводится к управлению народом посредством самого народа, т. е. к самоуправлению в марксистском его понимании.